HUMAN RIGHTS HOUSE VILNIUS

Human Rights House Foundation (HRH F)

Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь
Аляксандру Лукашэнку
Факс: (375 17) 226 06 10

Старшыню Вярхоўнага Суду Рэспублікі Беларусь
Валянціну Сукалу
Тэл./факс: (375 17) 227 12 25
E-mail: scjustrb@pmrb.gov.by

Міністру юстыцыі Рэспублікі Беларусь
Віктару Галаванаву
Тэл./факс: (375 17) 2009755

14 жніўня 2009 г.

**З нагоды адмовы ў рэгістрацыі ГПА "Наша Вясна"**

Беларускі Дом правоў чалавека ў Вільні (Літва) і Фундацыя дамоў правоў чалавека ў Осле (Нарвегія) выражаюць глыбокае расчараванне з нагоды рашэння Вярхоўнага Суду РБ пакінуць без задавальнення скаргу заснавальнікаў праваабарончага аб'яднання "Наша Вясна" на адмову ў рэгістрацыі. На наш погляд, гэтае рашэнне Суду з'яўляецца прыкладам палітычна матываванай адмовы праваабарончай арганізацыі ў рэалізацыі права на свабоду аб'яднанняў. Заклікаем беларускія ўлады прытрымлівацца нацыянальнага заканадаўства і міжнародных дакументаў, якія гэтае права гарантуюць.

12 жніўня 2009 г. Вярхоўны Суд РБ адхіліў скаргу на адмову ў рэгістрацыі грамадскага праваабарончага аб'яднання "Наша Вясна". Рашэнне Суду было матываванае неадпаведнасцю рэчаіснасці альбо скажэннем звестак, указаных у спісах заснавальнікаў, а таксама адмаўленнем рэгіструючаму органу ў правядзенні праверкі дакладнасці дакументаў, што звязаныя з юрыдычным адрасам арганізацыі. У спіс магчымых падстаў для адмовы ў рэгістрацыі грамадскага аб'яднання, прадугледжаных Артыкулам 15 Закона РБ "Аб грамадскіх аб'яднаннях", гэты від парушэнняў не ўключаны.

Акрамя таго, Артыкулам 15 Закона РБ "Аб грамадскіх аб'яднаннях" прадугледжаная магчымасць адтэрміноўкі дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання ў выпадку, калі дапушчаныя парушэнні ўсталяванай працэдуры паддаюцца выдаленню, каб заснавальнікі маглі выдаліць дапушчаныя неадпаведнасці. Паводле інфармацыі, якой мы валодаем, заснавальнікі "Нашай Вясны" выразілі жаданне выправіць парушэнні і прасілі аб адтэрміноўцы рэгістрацыі, што дазволіла б ім прывесці ўсе дакументы ў поўную адпаведнасць з патрабаваннямі Міністэрства Юстыцыі. Тым не менш, ім было адмоўлена.

Разумеем, што рашэнне аб адтэрміноўцы рэгістрацыі і прадстаўленне часу на выдаленне парушэнняў з'яўляецца правам, а не абавязкам Міністэрства Юстыцыі. Аднак улічваючы тое, што:

- парушэнні насілі нязначны характар;
- парушэнні відавочна не ўваходзілі ў лік тых, на падставе якіх артыкулам 15 Закона РБ "Аб грамадскіх аб'яднаннях" прадугледжаная адмова ў рэгістрацыі;
- названая арганізацыя з'яўляецца аўтарытэтным і вядомым у свеце праваабарончым аб'яднаннем, якому не ў першы раз даецца адмова ў рэгістрацыі без сур'ёзных на тое падстаў;

мы перакананыя, што **рашэнне не зарэгістраваць "Нашу Вясну" і не прадставіць заснавальнікам магчымасці выправіць парушэнні ў ходзе рэгістрацыі з'яўляецца палітычным крокам і актам непавагі да права на свабоду аб'яднанняў і права быць праваабаронцам.**

Заклікаем беларускія ўлады перагледзець рашэнне Вярхоўнага Суду РБ ад 12 жніўня г.г. і дазволіць заснавальнікам “Нашай Вясны” выдаліць адхіленні ды вярнуцца да працэдуры рэгістрацыі. Таксама заклікаем беларускія ўлады трымацца заканадаўства РБ і міжнародных абавязанняў, ратыфікаваных краінай – у прыватнасці, Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах (артыкул 22).

З павагай,

Фундацыя дамоў правоў чалавека, Нарвегія

Беларускі Дом правоў чалавека, Вільня (Літва)

Копіі дасылаюцца:

- Спецыяльнаму дакладчыку ААН па сітуацыі праваабаронцаў
- Спецыяльнаму дакладчыку ААН па спрыянні і ахове права на свабоду думкі і слова
- Камітэту ААН па правах чалавека
- АБСЕ/БДІПЧ, Варшава
- Міністэрству замежных спраў Нарвегіі
- Пастаяннаму камітэту па замежных справах Парламенту Нарвегіі
- Амбасадзе Нарвегіі ў Кіеве
- Міністэрству замежных спраў Літвы
- Міністэрству замежных спраў Швейцарыі
- Бюро Амбасады Швейцарыі ў Кіеве
- Місіі Злучаных Штатаў Амерыкі пры ААН у Жэневе
- Дэлегацыі Еўрапейскай Камісіі у Беларусі